1) павысіць вытворчасць працы педагогаў і студэнтаў;

2) інтэнсіфікаваць вучэбны працэс за кошт аператыўнага ўспрымання, апрацоўкі і прадстаўлення вучэбнага матэрыялу;

3) стварыць якасна новую інфармацыйна-інструментальную аснову правядзення вучэбнага працэсу;

4) рацыянальна змяніць методыку навучання, час навучання і склад педагагічнага саставу;

5) стварыць магчымасць навучання прадстаўнікам розных культур і культурнага інфармацыйнага абмену;

6) павысіць агульную эфектыўнасць вучэбнага працэсу ў галіне культуры за кошт росту эфектыўнасці засваення ведаў. Гэта забяспечваецца матывацыяй навучання (працэс навучання становіцца цікавым і актуальным); развіццём кааперацыі (сумеснай працы ў вызначаных межах); зніжэннем ступені ізаляванасці, хуткасцю забеспячэння актуальнай інфармацыяй.

**С.В.Пуш,**
*аспірантка кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры*

## СЯДЗІБА САПЕГАЎ У РУЖАНАХ ЯК ЦЭНТР МАСТАЦКАГА ЖЫЦЦЯ БЕЛАРУСІ XVII–XVIII стст.

Ружаны – вядомы гісторыка-культурны цэнтр у Беларусі. У XVII–XVIII стст. тут знаходзілася буйнейшая рэзідэнцыя, якая належала Сапегам, адным з багацейшых магнатаў Рэчы Паспалітай.

Гэту сядзібу ў 1598 г. Барташ Брухальскі прадаў Льву Іванавічу Сапегу. Ружаны ў XVIII ст. уяўлялі невялікі па памерах, але важны культурны цэнтр. Тут былі Петрапаўлаўская уніяцкая царква і манастыр базыльян, Троіцкі касцёл дамініканцаў у стылі ранняга барока, дзе гучаў арган, і палацавы комплекс. Яны былі адноўлены і перабудаваны архітэктарам Янам Самуэлем Бэкерам. Доўгі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

час Ружаны належалі моцнаму роду Сапегаў, які фарміраваўся на працягу некалькіх стагоддзяў. Прадстаўнікі гэтага славутага роду цікавіліся культурай, былі адукаванымі і дапытлівымі. Леў Сапега – дзяржаўны і грамадскі дзеяч, канцлер Вялікага княства Літоўскага, паходзіў са старажытнага роду аршанскіх баяр. Дзякуючы яму быў пабудаваны Троіцкі касцёл і пачаў будавацца палац.

Музычнае жыццё ў маёнтку фарміравалася яшчэ з XVII ст. Музыка суправаджала прыёмы, сямейныя святы. Музычнае жыццё найбольш ажывілася, калі адбылося парадненне двух знакамітых родаў – Сапегаў і Масальскіх.

Прадстаўніца Сапегаў Катажына выйшла замуж за Йозэфа Масальскага, падчашага літоўскага. Яго бацька Міхал Масальскі, гетман Вялікага княства Літоўскага, быў дасведчаным чалавекам, цікавіўся музыкай. Ён трымаў прыдворную капэлу. Вядома, што капэла М.Масальскага выступала ў 1752 г. у Ружанскім палацы Сапегаў. З нагоды шлюбу маладых у 1752 г. у Ружанах адбылося вясельнае застолле, дзе прысутнічала многа гасцей. Была тут і капэла, якая «іграла на духавых інструментах урачысты марш», далей рухаліся конніца, пяхота і інш. Усюды гучала музыка, успыхвалі феерверкі.

У гэтай незвычайнай рэзідэнцыі размяшчаўся адзін з буйнейшых тэатраў у Беларусі. Палац, у якім знаходзіўся тэатр, спачатку ўяўляў сабой двухпавярховы крыжападобны будынак з трыма вежамі. Пасля яго перабудовы ў XVIII ст. быў створаны палацавы комплекс вакол параднага двара. Усходні корпус падзяляўся параднай лесвіцай на тэатр і манеж. Тэатр меў глыбокую, утульную сцэну, прыстасаваную да вялікіх балетных паказаў і оперных спектакляў. На сцэне дзейнічалі сем планаў куліс, што дазваляла тройчы змяняць афармленне ў час спектакля. Тэатральная зала складалася з двух ярусаў, у першым было 14 ізаляваных ложаў, у другім – 15, сярод якіх была і каралеўская ложа. Яны былі своеасабліва ўпрыгожаны рознымі калонамі, балюстрадамі. Частка зальнай прасторы была захавана для аркестра.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тэатр існаваў, мабыць, з 1765 г., аб чым сведчаць падлікі даходаў і расходаў княстваў Дзярэчынскага і Зэльвенскага за 1765 і 1769 гг., а таксама звесткі з інвентарнага вопісу палаца ў Ружанах за 1793г.

У тэатральную трупу ўваходзілі каля 60 чалавек. Пры тэатры існавала капэла, якой валодаў канцлер Вялікага княства Літоўскага Аляксандр Міхал Сапега з 1765 г. У ёй працавалі як замежныя, так і мясцовыя музыканты. Вядома, што капельмайстрам аркестра быў вядомы венецыянскі скрыпач і кампазітар Карм'е Чыпрыяні, які вучыў прыгонных князя іграць на скрыпцы. Ён з'яўляўся аўтарам скрыпічных канцэртаў, быў вядомы па сваіх выступленнях у Гданьску (1770), Пецярбургу (1774). Пасля Сапегаў ён працаваў у Агінскага ў Слоніме, у Тышкевічаў у Свіслачы, потым у Варшаве. У аркестры таксама іграў польскі скрыпач і кампазітар Тэадор Зігмунтоўскі. Сярод капэлістаў Сапегі значацца Тамашка, Бельке, Ляховіч, М.Паўкер (скрыпач і скрыпічны майстар), Я.Казлоўскі, Жэдро (клавесініст), Войцэх Жыўны — чэшскі піяніст, кампазітар, які ў далейшым стаў настаўнікам Ф.Шапэна. Капэла А.Сапегі выступала ў 1763 г. на імянінах свайго ўладальніка, а ў 1784 г. яе слухаў у Ружанах кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі (сам ён нарадзіўся на Брэстчыне, у маёнтку Воўчын). Яму вельмі падабалася выступленне прыдворнай капэлы, і ён шчодра адарыў музыкантаў. Відаць, выканальніцкі ўзровень гэтага калектыву быў вельмі высокі. Да прыезду караля ўсе рыхтаваліся, нават спецыяльна былі напісаны арыі, якія на канцэрце выканалі італьянскі тэнар Вінчэнца Гікаліні і кампазітар Джаакіна Альберціні. Пры тэатры была створана музычна-оперная школа, дзе маглі вучыцца дзеці прыгонных сялян.

Ружанская сцэна цікавіла Адама Чартарыйскага і Юльяна Нямцэвіча, якія наведвалі Ружаны і Слонім. Ю.Нямцэвіч быў вядомым пісьменнікам, палітычным дзеячам таго часу, аўтарам драматычных твораў. Нарадзіўся ён на Брэстчыне (цяпер в.Скокі Брэсцкага раёна). У

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ружанскім тэатры давялося яму глядзець аднаактовую оперу Ж.-Ж.Русо «Вясковы чараўнік», якая ішла ў 1778 г. На думку Ю.Нямцэвіча, акцёры (маладыя сялянкі і сяляне) сыгралі вельмі добра французскую оперу.

12 жніўня 1784 г. у тэатры адбылася прэм'ера балета «Літасцівасць Ціта». Паставіў балет знакаміты балетмайстар Мацей Прэнчынскі, які працаваў у Ружанах з 1780 г. па 1785 г. Прыехаў ён сюды ўжо вядомым балетмайстрам з Варшавы, з імем «першага танцора ў танцах паўхарактарных». На прэм'еры балета прысутнічаў Станіслаў Аўгуст, які прыбыў на Гродзенскі сойм. Кароль захапляўся музыкай, тэатрам, таму ў вольны час заўсёды наведваў яго. У дзень прэм'еры М.Прэнчынскі падарыў каралю друкаванае лібрэта балета. Пазней вядомы балетмайстар кіраваў віленскім балетам.

Разам з балетам «Літасцівасць Ціта» ішла камедыя «Чарадзейнае дрэва». Пераклад яе зрабіў Заблоцкі, а музыку напісаў Ян Стэфані. У рэпертуары тэатра быў балет «Арынянка». Аб зацікаўленасці гаспадара ў існаванні тэатра і дзейнасці здольных артыстаў сведчыць пералік кніг у тэатральнай бібліятэцы, сярод якіх — каштоўная французская літаратура, работы па тэатры, крытычная літаратура аб італьянскім і французскім тэатрах і інш. У бібліятэцы тэатра таксама знаходзіліся п'есы Ф.Багамольца і У.Радзівіл. Зборнік п'ес У.Радзівіл захоўваўся ў бібліятэцы Сапегаў да 1786 г.

Ружанскі тэатр даваў спектаклі і ў Дзярэчыне, дзе А.Сапега меў мураваны палац. Акрамя капэлы ў Ружанах, існавалі прыдворныя капэлы ў Дзярэчыне і Зэльве, багатых прыватных уладаннях Сапегаў. Там былі тэатр, балет, гучала музыка. Для сучаснікаў, як пісаў у сваёй кнізе «Успаміны аб Свіслачы, Дзярэчыне і Ружанах» Л.Патоцкі, гэта было «і модна, і прыемна».

Аляксандр Сапега валодаў тэатрам у Ружанах з 1780 г. па 1791 г., але паступова тэатральнае жыццё тут стала заціхаць, бо А.Сапега пераехаў у Дзярэчын. Туды была перавезена і багацейшая бібліятэка.

Вядома, што яшчэ ў студзені 1757 г. канцлер быў на спектаклі ў сядзібе Міхала Казіміра Радзівіла, ваяводы віленскага і гетмана Вялікага княства Літоўскага. На сцэне ішла камедыя Вальтэра (назва невядомая). Аляксандру Сапегу прысвяціў сваю камедыю Марэвіч, ротмістр ваяводы Трокскага.

Ружанскі музычны тэатр, які развіваўся ў мясцовым культурным асяроддзі пры ўдзеле замежных і мясцовых выканаўцаў, збіраў на свае канцэрты і спектаклі шматлікіх слухачоў і гледачоў. Ён, безумоўна, з'яўляўся часткай музычнай культуры гэтага рэгіёну ў XVII—XVIII стст. і разам з тым увайшоў у агульную спадчыну беларускай культуры.

**Л.М.Сідаровіч,**
*суіскальнік кафедры беларускай*
*і сусветнай мастацкай культуры*

## ПАРАЎНАЛЬНЫ АНАЛІЗ ПСАЛМОЎ З "РЫФМАТВОРНАГА ПСАЛТЫРА" СІМЯОНА ПОЛАЦКАГА І ВАСІЛЯ ЦІТОВА ПА РОЗНЫХ СПІСАХ

Адной з малавывучаных старонак культурнай спадчыны славян з'яўляецца "Рыфматворны псалтыр" Сімяона Полацкага і Васіля Цітова, які працяглы час лічыўся помнікам выключна рускай культуры.

Адзін з яго аўтараў — Сімяон Полацкі (Самуіл Гаўрылавіч (Емяльянавіч) Пятроўскі-Сітніяновіч), беларус па паходжанні, ураджэнец г. Полацка, дзе ён працяглы час жыў, вучыўся, сфарміраваўся як асоба і як навуковец, увайшоў у гісторыю як вялікі асветнік-гуманіст, грамадскі і царкоўны дзеяч, філосаф, прапаведнік, паэт, драматург, чалавек энцыклапедычных ведаў (1).

Другі яе аўтар — Васіль Цітоў — таленавіты кампазітар, стваральнік шэрага многагалосых кампазіцый, якія гучаць і ў нашыя дні ў выкананні розных калектываў, вучань Мікалая Дзілецкага, цесна звязанага з культурай беларускіх і ўкраінскіх зямель.